Источник: "Звязда" - 2013-09-04

Даты | Падзеі | Людзі

**1563** год — у Брэсцкай друкарні выдадзена Біблія, у якой былі змешчаны ўсе тэксты Старога і Новага запаветаў. Мецэнатам з'яўляўся Мікалай Радзівіл Чорны, таму Брэсцкая Біблія яшчэ называецца Радзівілаўскай. Гэта самая вялікая і багата афармленая беларуская друкаваная кніга XVI стагоддзя. У пераплёце са скуры, з цудоўнымі ілюстрацыямі і нават з прадметным паказальнікам (што было ўпершыню ў беларускім кнігадрукаванні). На кожнай старонцы на палях ёсць каментарыі да тэксту. У кнізе 738 старонак. Надрукавана гатычным шрыфтам у дзве калонкі па 58 радкоў у кожнай. Асобнікі Брэсцкай Бібліі захоўваюцца ў Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы ў Маскве, Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Пецярбургу, Цэнтральнай бібліятэцы АН Літвы, у Ягелонскай бібліятэцы ў Кракаве, няпоўны асобнік — у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа НАН Беларусі.

**1837** год — вядомы мастак і электрык-аматар Сэмюэл Морзэ ўпершыню прадэманстраваў сваё вынаходніцтва — тэлеграф. Дэманстрацыя адбылася ў Нью-Ёркскім універсітэце. Праект быў наіўны і надзвычай складаны, аднак зрабіў на запрошаных вялікае ўражанне. Паспяховы прамысловец Стывен Вейл прапанаваў Морзэ дзве тысячы долараў і памяшканне для вопытаў, а таксама дапамогу свайго сына Альфрэда. На працягу чатырох месяцаў тэлеграфны апарат быў удасканалены, і, галоўнае, Морзэ распрацаваў сваю сапраўды знакамітую азбуку — спалучэнне кропак і працяжнікаў.



**1943** год — 70 гадоў таму ў Крамлі ўпершыню пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі І. Сталін прыняў у сябе вышэйшых іерархаў праваслаўнай царквы. Аўдыенцыі ў Сталіна ўдастоены мітрапаліты Кіеўскі, Ленінградскі і Маскоўскі. Гэтаму ў немалой ступені спрыяла патрыятычная дзейнасць у гады вайны праваслаўнай царквы, якую ўзначальваў Сергій, мітрапаліт Маскоўскі, патрыяршы месцаахоўнік. Сабраныя вернікамі сродкі ў Фонд абароны, створаныя на іх танкавыя часці, авіяэскадрыллі і шпіталі, як відаць, сталі найлепшым аргументам на карысць таго, што рэлігія не толькі опіум для народа. Вынікам сустрэчы стаў дазвол на адкрыццё шэрагу семінарый і правядзенне выбараў патрыярха ўсяе Русі. Скліканы 8 верасня таго ж года Архірэйскі Сабор адкрытым галасаваннем выбраў мітрапаліта Сергія (Страгародскага) Патрыярхам Маскоўскім і ўсяе Русі.

## Было сказана

**Уладзімір КАРАТКЕВІЧ, паэт, празаік:**

***«Дзе праца, там і перспектывы».***